# *§ 37–0. Эпоха Асветніцтва

**1. Уплыў Асветніцтва на ўяўленні аб узаемаадносінах улады і грамадства.** У XVIII ст. у Еўропе сярод адукаванай часткі грамадства панавала вера ў чалавечы розум, творчую ўсёмагутнасць чалавека. Асветнікі лічылі магчымым дасягнуць змен існуючага несправядлівага грамадскага парадку шляхам барацьбы з невуцтвам, пашырэння навуковых ведаў. Яны меркавалі, што чалавек, узброены ведамі, спазнаўшы ісціну, стане лепшым, больш вольным, таму асаблівую ролю надавалі навуцы, стаўленне да якой было ў іх падобнае да рэлігійнай веры.

Носьбітамі ідэй Асветніцтва рабіліся адукаваныя людзі — прадстаўнікі эліты, вузкага кола інтэлектуалаў, якія няўхвальна глядзелі на ідэю пашырэння ведаў сярод простага народа, прызначэннем якога яны лічылі фізічную працу.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**«Два трактаты аб праўленні». Джон Лок**

*Раздзел VII. Аб палітычным або цывільным грамадстве.*

87. Чалавек нараджаецца, як ужо было даведзена, маючы права на поўную свабоду і неабмежаванае карыстанне ўсімі правамі і прывілеямі натуральнага закону ў такой самай меры, як усякі іншы чалавек або ўсякія іншыя людзі ў свеце, і ён паводле прыроды мае ўладу не толькі ахоўваць сваю ўласнасць, г. зн. сваё жыццё, свабоду і маёмасць, ад шкод і нападаў з боку іншых людзей, але таксама судзіць і караць за парушэнне гэтага закону іншых, як таго заслугоўвае, на яго погляд, гэтае злачынства, нават смерцю ў тых выпадках, калі гнюснасць учынку, паводле яго перакանання, таго патрабуе.

*Раздзел X. Аб формах дзяржавы.*

134. Асноўнай мэтай уступлення людзей у грамадства з'яўляецца імкненне мірна і бяспечна карыстацца сваёй уласнасцю, а асноўнай прыладай і сродкам для гэтага з'яўляюцца законы, усталяваныя ў гэтым грамадстве; першым і асноўным станоўчым законам усіх дзяржаў з'яўляецца ўсталяванне заканадаўчай улады; гэтаксама першым і асноўным натуральным законам, якому мае падпарадкоўвацца сама заканадаўчая ўлада, з'яўляецца захаванне грамадства і (у той меры, у якой гэта будзе адпавядаць грамадскаму дабру) кожнага члена грамадства. Гэтая заканадаўчая ўлада з'яўляецца не толькі вярхоўнай уладай у дзяржаве, але і свяшчэннай і нязменнай у руках тых, каму грамадства аднойчы яе даверыла.

*Раздзел XII. Аб заканадаўчай, выканаўчай і федэратыўнай уладзе ў дзяржаве.*

144. Але паколькі законы, што ствараюцца аднойчы і на кароткі тэрмін, валодаюць сталай і ўстойлівай сілай і патрабуюць няспыннага выканання або назірання за гэтым выкананнем, дык неабходна, каб увесь час існавала ўлада, якая сочыць за выкананнем тых законаў, якія створаны і застаюцца ў сіле. І, такім чынам, заканадаўчую і выканаўчую ўладу нярэдка трэба падзяляць.

1. *Якая, на думку Дж. Лока, асноўная «мэта ўступлення людзей у грамадства»?*
2. *Што аўтар разумее пад свабодай чалавека?*
3. *Чаму Дж. Лок сцвярджае, што заканадаўчую і выканаўчую ўладу неабходна падзяляць?*

**«Аб грамадскім дагаворы, або Прынцыпы палітычнага права».**
**Жан-Жак Русо**

*Раздзел VI. Аб грамадскім пагадненні.*

Знайсці такую форму асацыяцыі, якая бароніць і ахоўвае ўсёю грамадскай сілай асобу і маёмасць кожнага сябра асацыяцыі і дзякуючы якой кожны, злучаючыся з усімі, падпарадкоўваецца, аднак, толькі самому сабе і застаецца такім самым свабодным, як і раней. Такая асноўная задача, якую вырашае грамадскі дагавор.

*Раздзел XI. Аб розных сістэмах заканадаўстваў.*

Калі паспрабаваць вызначыць, у чым менавіта палягае тое найвышэйшае для ўсіх дабро, якое павінна выступаць мэтай усякай сістэмы законаў, дык выявіцца, што яно зводзіцца да дзвюх галоўных рэчаў: свабоды і роўнасці. Да свабоды — паколькі ўсякая залежнасць ад прыватнай асобы настолькі ж памяншае моц Дзяржавы; да роўнасці, таму што свабода не можа існаваць без яе.

*1. Якую асноўную задачу вырашае грамадскі дагавор, паводле Ж.-Ж. Русо?*
*2. Чаму свабода і роўнасць разглядаюцца як галоўныя каштоўнасці, да якіх мае імкнуцца прававая сістэма?*
*3. Вызначце, што агульнага ў поглядах Дж. Лока і Ж.-Ж. Русо.*
*4. Складзіце тэзісы адказу на тэму «Ідэі асветнікаў», вылучыўшы ключавыя пытанні, асветленыя ў працах мысляроў Асветніцтва, агульныя рысы іх поглядаў і адрозненні, што назіраюцца паміж імі.*

**2. Уплыў Заходняй Еўропы на культурныя працэсы ў Расіі.** На працягу XVI–XVII стст. сувязі Расійскай дзяржавы з заходнееўрапейскімі дзяржавамі няўхільна раслі. Але да перыяду праўлення Пятра I іншаземны ўплыў быў неглыбокі, непастаянны і строга практычны. Расійскія ўладары дапускалі запазычанні ў вайсковай справе, цікавіліся тэхнічнымі навінамі, заахвочвалі гандаль. У асяродку расійскай знаці пашыралася мода на ўсё іншаземнае, у тым ліку еўрапейскі касцюм.

У Расіі былі знаёмыя з ладам жыцця еўрапейцаў («немцаў», як звалі тады ўсіх замежнікаў з Захаду). У Маскве ад сярэдзіны XVII ст. існавала Нямецкая слабада, у якую былі перaселены ўсе чужаземцы, што жылі ў сталіцы і не прынялі праваслаўе. Жыхарамі слабады былі замежнікі, што трапілі ў палон, гандляры, вайскоўцы на рускай службе і інш. Але яе ўплыў на расійскае грамадства быў зусім нязначны.



*У Нямецкай слабадзе. Мастак А. М. Бенуа. 1911 г.*

За Пятром І заходнееўрапейскі культурны ўплыў шматразова ўзмацніўся. У 1697–1698 гг. у складзе вялікага пасольства ў шэрагу заходнееўрапейскіх дзяржаў пабываў малады гасудар Пётр І. Найбольш расійскага цара цікавілі караблебудаванне, уладкаванне разнастайных механізмаў, навуковыя дасягненні еўрапейцаў, у тым ліку ў медыцыне, анатоміі. Расійскі ўладар прымусова і шмат у чым сваім асабістым прыкладам істотна пераўтварыў побыт найперш вышэйшага саслоўя дзяржавы — дваранства, а таксама купецтва і вярхушкі гараджан. Каб адпавядаць новым патрабаванням, неабходна было галіць бароды, насіць парыкі, апранацца ў адзенне на нямецкі або французскі ўзор. Пётр І рашуча парушыў векавы патрыярхальны лад паўсядзённага жыцця з традыцыямі ў духу «Дамастрою». Звыклымі сталі пятроўскія асамблеі (сходы), а пазней балі, на якіх прысутнічалі як мужчыны, так і жанчыны.



Веер. Каля 1750 г.

Росквіт выкарыстання вeeраў як у Заходняй Еўропе, так і ў Расіі прыпаў на сярэдзіну XVIII ст. Складны веер зрабіўся незаменнай часткаю жаночага гардэробу. Ва ўмовах распаленых пячэй, мноства свечак, процьмы насякомых і адсутнасці вентыляцыі кабеты выкарыстоўвалі веера для ахаладжэння паветра вакол сябе, тады як купецкія жонкі больш любілі махаць хусткамі. Веер неўзабаве ператварыўся ў сродак невербальных зносін паміж дамай і яе прыхільнікам. Значэнне меў не толькі колер веера, але і розныя яго пазіцыі, якімі можна было замяніць словы.
Паступова веер страціў сваё пачатковае прызначэнне — стварэнне прахалоды, ператварыўшыся ў інструмент вытанчанага флірту. Для авалодання асаблівай «мовай веера», якая вымагала пэўных навыкаў, у Расіі выкарыстоўвалася паняцце «маханне». З цягам часу гэты тэрмін пачаў асацыявацца з пустымі размовамі.

*Распрацуйце некалькі правіл «мовы веера» накшталт тых, што ўжываліся ў XVIII ст. Гэтыя правілы павінны апісваць, якія жэсты і рухі веера сімвалізуюць пэўныя эмоцыі, намеры або сігналы ў перамовах паміж дамай і кавалерам.*

Заходнееўрапейскі ўплыў аказаўся істотны і шмат у якіх іншых галінах жыцця расійскага грамадства — у арганізацыі адукацыі, архітэктуры, жывапісе, скульптуры, кнігадрукаванні, выданні газет, музыцы, тэатры, баўленні вольнага часу і інш.

Ад часу праўлення Пятра I і да канца XVIII ст. адзначалася перавага нямецкага ўплыву ў галіне культуры, навукі, арганізацыі кіравання. Паступова на змену нямецкім традыцыям прыходзіць мода на ўсё французскае, у тым самым стагоддзі ў Расіі з'яўляюцца і англафілы.

Надзвычай важная была роля Заходняй Еўропы ў развіцці расійскай навукі. У Пецярбурзе была заснаваная першая ў Расіі бібліятэка, усталявана славутая Кунсткамера («кабінет рэдкасцей»), у якой дэманстраваліся заалагічныя калекцыі, зборы мінералаў, разнастайныя вырабы і «монстры» — жывыя і заспіртаваныя. З захаду прыйшла ідэя стварэння Акадэміі навук, якая была заснаваная ў Пецярбурзе ў 1725 г. У гэтым выпадку расійскія ўлады больш арыентаваліся на Берлінскую акадэмію навук. Другім маяком для расійскай навукі было Каралеўскае таварыства ў Лондане, з якім расійская Акадэмія была шчыльна звязана ад першых дзён свайго існавання.



*Галоўны фасад Кунсткамеры. 1740 г.*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**З працы Г. У. Вярнадскага «Руская гісторыя»**

Арганізацыя Акадэміі навук раней за ўніверсітэты або вышэйшыя школы на першы погляд выглядае непрактычным заняткам; аднак гэта зрабіла велізарны ўплыў на развіццё ў Расіі адукацыі… Хоць першыя сябры Акадэміі прыбылі з-за мяжы, да іх неўзабаве далучыліся адукаваныя людзі, рускія з паходжання.

**Адрозненні заходнееўрапейскіх акадэмій ад Пецярбургскай акадэміі навук**

| Акадэміі навук у Заходняй Еўропе | Акадэмія навук у Расіі |
|---|---|
| • былі прыватнымі або грамадскімі, існавалі на ахвяраванні;<br>• падводзілі вынікі навуковых даследаванняў, што выконваліся ва ўніверсітэтах | • фінансавалася дзяржавай;<br>• непасрэдна займалася навукай |

1. *Чаму Г. У. Вярнадскі лічыць адкрыццё ў Расіі Акадэміі навук да таго, як у ёй з'явіліся ўніверсітэты, «непрактычным заняткам»?*
2. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, вызначце, што аб'ядноўвала Акадэмію навук, заснаваную Пятром I, і навуковыя ўстановы Еўропы.*
3. *Чаму першымі расійскімі акадэмікамі былі іншаземцы? Каго з замежных вучоных, што працавалі ў Расіі ў XVIII ст., вы ведаеце?*
4. *Хто быў першы рускі акадэмік? Чым ён знакаміты?*
5. *Якое значэнне мела стварэнне Акадэміі навук для культурнага абмену паміж Расіяй і Заходняй Еўропай? Якую ролю яна адыграла ў развіцці расійскай навукі?*

На ўзор еўрапейскіх у Расіі ствараліся і іншыя навуковыя таварыствы. Так, у 1765 г. у Пецярбурзе было зацверджана Вольнае эканамічнае таварыства. Да ліку яго задач належалі выкарыстанне назапашанага ў Еўропе навукова-практычнага досведу, падтрыманне кантактаў з падобнымі навуковымі арганізацыямі за мяжой. Такім чынам адбывалася запазычванне еўра-

пейскіх традыцый у галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасці.

У цэлым на працягу ўсяго XVIII ст. іншаземцы аказвалі вельмі істотны ўплыў на станаўленне новай Расіі, якая здолела перамагчы працяглую ізаляцыю іператварыцца ў адну з вялікіх дзяржаў. Аднак шмат у чым еўрапейская культура зрабілася атрыбутам прыдворных колаў і найвышэйшых пластоў грамадства і зусім не закранула асноўную масу насельніцтва, перадусім сялян. Больш за тое, успрыняцце дваранствам вонкавых атрыбутаў еўрапейскай культуры, у тым ліку чужой мовы, узмацніла культурны раскол у расійскім грамадстве; у выніку было разарвана яго традыцыйнае адзінства.

*Выкарыстоўваючы ўрывак з «Дзённіка камер-юнкера» Ф. В. Берхгольца, вызначце, якія іншаземныя навіны былі ўведзены пры Пятру I і якія старарускія традыцыі захаваліся ў свецкім баўленні часу.*

«Усякі мае свабоду рабіць што хоча, то-бок можа або танцаваць, або курыць тытунь, або гуляць, або размаўляць, або глядзець на іншых; роўным чынам усякі можа спытаць сабе пры жаданні віна, піва, гарэлкі, чаю, кавы і адразу атрымае, што патрабаваў. Што мне не падабаецца на гэтых асамблеях, дык гэта тое, што ў пакоі, дзе да́мы і дзе танцы, кураць тытунь і гуляюць у шашкі, ад чаго бывае смурод і стукат, зусім недарэчныя пры да́мах і пры музыцы, і тое, што да́мы заўсёды сядзяць асобна ад мужчын, так што з імі нельга размаўляць, калі не танцуюць, — усе сядзяць як нямыя і толькі глядзяць адны на адных».